


**Мікалай ЗАБАЎСКІ**

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА на старонках газеты "Наша ніва" ў 1906—1915 гг.

## *Да 100-годдзя расійскага парламентарызму і "Нашай нівы"*



*ЗАБАЎСКІ Мікалай Міхайлавіч — доктар гістарычных навук, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка. Нарадзіўся ў 1953 г. у г. Мар'іна Горка Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. У 1979 г. скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага. З 1979 па 1984 г. выкладаў у Мінскім педвучылішчы. У 1984—1987 гг. аспірант, у 1987—1993 гг. навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі перыяду капіталізму Інстытута гісторыі АН БССР. З 1993 г. дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя Максіма Танка. У 2000 г. абараніў доктарскую дысертацыю. З 2002 па 2004 г. загадчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры факультэта беларускай філалогіі і культуры, з 2004 г. дэкан гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка. Аўтар манаграфіі "Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.)" (Мн., 1999), больш за 80 навуковых артыкулаў. Даследуе гісторыю палітычных партый Беларусі, праблемы дарэвалюцыйнага парламентарызму і культуры Беларусі пачатку XX ст.*

На працягу XIX ст. з удзелам манархаў былі падрыхтаваны і абмяркоўваліся некалькі праектаў увядзення ў Расійскай імперыі народнага прадстаўніцтва. Яшчэ ў 1809 г. з адабрэння Аляксандра І быў распрацаваны праект М.М.Сперанскага. У ім планавалася стварыць і надзяліць заканадаўчымі правамі Дзяржаўную думу, члены якой выбіраліся б на тры гады дэпутатамі губернскіх дум і зацвярджаліся імператарам[1].

9 студзеня 1905 г. расстрэлам мірнага шэсця рабочых у Санкт-Пецярбургу пачалася першая расійская рэвалюцыя. Яе маштабы вымусілі царызм да правядзення тэрміновых дзяржаўных рэформ. Савет Міністраў пачаў абмеркаванне пытання аб народным прадстаўніцтве, была склікана спецыяльная нарада. 3 і 11 лютага 1905 г. большасць яе ўдзельнікаў выказалася за ўвядзенне ў Расіі дарадчага народнага прадстаўніцтва. 18 лютага цар зноў узняў пытанне аб "закліку лепшых людзей Расіі" для кансультацый па ўдасканаленні заканадаўства. Міністру ўнутраных спраў А.Р.Булыгіну было даручана распрацаваць адпаведны законапраект. Міністр прапанаваў падаваць петыцыі па гэтым пытанні, што дало апазіцыі дадатковую магчымасць для выказвання публічных пратэстаў супраць самадзяржаўя. Савет Міністраў прыступіў да разгляду не толькі заканадаўчых, але і сацыяльна-эканамічных рэформ.

Рэвалюцыйны рух пашыраўся, і 18 ліпеня 1905 г. у Пецяргофе пачаліся нарады па стварэнні Дзяржаўнай думы. У іх удзельнічалі вялікія князі, міністры, найбольш уплывовыя члены Дзяржаўнага савета, некалькі сенатараў, а таксама вядомы гісторык прафесар В.В.Ключэўскі. Праект, які абмяркоўваўся з 19 па 26 ліпеня, быў заканадаўча аформлены ў актах ад 6 жніўня 1906 г.: маніфесце "Аб устанаўленні Дзяржаўнай думы", ва "Устанаўленні Дзяржаўнай думы", у "Палажэнні аб выбарах у Дзяржаўную думу".

Дума павінна была быць не заканадаўчай, а дарадчай і склікацца на пяць гадоў. Імператар меў права датэрмінова яе распускаць з абавязковым прызначэннем новых выбараў. У кампетэнцыю Думы ўваходзіла абмеркаванне новых законаў, выключаючы Асноўныя дзяржаўныя законы, змяненне, дапаўненне ці адмена дзеючых законаў; абмеркаванне дзяржаўнага бюджэту, каштарысаў міністэрстваў і галоўных упраўленняў, справаздач дзяржаўнага кантралёра, спраў пра адчужэнне дзяржаўных даходаў і маёмасці, пабудову чыгунак за кошт казны, заснаванне акцыянерных кампаній і г. д.

Адобраныя Думай законапраекты паступалі на разгляд Дзяржаўнаму савету, потым — імператару. Нягледзячы на тое, што ў маніфесце "Аб устанаўленні Дзяржаўнай думы" падкрэслівалася "не-

датыкальнасць Асноўных законаў Расійскай імперыі аб сутнасці самадзяржаўя". "Устанаўленне Дзяржаўнай думы" прадугледжвала пэўнае абмежаванне правоў манарха. На яго разгляд маглі паступаць толькі тыя законапраекты, якія былі адобраны думскай большасцю, у адваротным выпадку яны вярталіся міністрам[2] і ў Дзяржаўны савет, які меў вопыт у распрацоўцы законаў. Імператар мог выдаваць законы і без іх рашэнняў, але абмеркаванне законаў давала магчымасць высветліць адносіны да іх грамадства. І можна было чакаць, што без сур'ёзных падстаў манарх наўрад ці стаў бы дзейнічаць супраць іх рашэнняў.

Па "Палажэнню аб выбарах у Дзяржаўную думу" ўсе выбаршчыкі падзяляліся на 3 курыі (разрады выбаршчыкаў, аб'яднаных формай уласнасці ці прыналежнасцю да пэўнага саслоўя): землеўладальніцкую (памешчыкі), гарадскую (мяшчане) і сялянскую. Дзве першыя курыі мелі перавагу на выбарах. Для іх выбары былі двухступенныя. Для сялян, якія вялі сваю гаспадарку, сістэма выбараў ускладнялася. На першым этапе сяляне выбіралі дзесяцідворных (выбаршчык ад 10 двароў) на валасны сход. На валасных сходах абіраліся ўпаўнаважаныя (па 2 ад воласці) на павятовы сход, на якім выбіраліся ўпаўнаважаныя на губернскі выбарчы сход. Там выбаршчыкі ад сялян, памешчыкаў і буржуазіі абіралі дэпутатаў Думы.

Прадугледжваўся высокі маёмасны і ўзроставы цэнз. На павятовы сход землеўладальнікаў, напрыклад, запрашаліся ўласнікі маёмасці коштам не менш за 15 тыс. руб., на гарадскія сходы — уласнікі нерухомай маёмасці коштам не менш за 1 500 руб. (у сталіцах — не менш за 3 тыс. руб.). Да гарадскіх выбаршчыкаў былі залічаны плацельшчыкі кватэрнага падатку ў сталіцах ад 1 320 да 1 440 руб., у павятовых гарадах — ад 540 да 600 руб. Большасць насельніцтва — асобы, маладзейшыя за 25 гадоў, батракі, жанчыны, вайскоўцы, навучэнцы і інш. — не мела выбарчых правоў[3].

Праект Булыгінскай думы быў манеўрам, пры дапамозе якога ўрад імкнуўся стварыць бачнасць рэфармавання дзяржаўнага ладу, заключыць саюз з памешчыкамі і буржуазіяй, а таксама прывабіць частку сялянства. Мікалай ІІ спадзяваўся, што "сялянская" Дума будзе адпавядаць таму "сапраўднаму статусу рускага народа", у які манарх працягваў глыбока верыць. Аднак урэзаныя выбарчыя правы насельніцтва і абмежаваная ў сваіх паўнамоцтвах Дзяржаўная дума не маглі ўжо задавальняць грамадства. Заканадаўчыя акты ад 6 жніўня састарэлі яшчэ да таго, як былі падпісаны Мікалаем ІІ.

Кастрычніцкая Усерасійская палітычная стачка яшчэ больш абвастрыла сітуацыю. 8 кастрычніка 1905 г. старшыня Савета Міністраў С.Ю.Вітэ падрыхтаваў даклад імператару з прапановамі: надзяліць Думу заканадаўчымі правамі, рэфармаваць Дзяржаўны савет, стварыць аб'яднанае міністэрства "з асоб, якія карыстаюцца павагай грамадскасці", паступова перайсці да ўсеагульнага выбарчага права, пашырыць паўнамоцтвы органаў мясцовага самакіравання, вырашыць аграрнае пытанне таксама і за кошт казённых зямель, рэарганізаваць дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка і інш.

Цар адобрыў даклад і даручыў С.Вітэ падрыхтаваць тэкст маніфеста да насельніцтва, які і быў падпісаны 17 кастрычніка 1905 г. У ім прадугледжвалася: 1) дараваць насельніцтву грамадзянскія свабоды на пачатках недатыкальнасці асобы: свабоды сумлення, слова, сходаў і саюзаў; 2) не перапыняючы аб'яўленых выбараў у Дзяржаўную думу, прыцягнуць да ўдзелу ў іх тыя слаі, якія не мелі выбарчых правоў; 3) абавязковае зацвярджэнне законаў Дзяржаўнай думай; 4) народным выбраннікам прадастаўлялася права нагляду за выкананнем законаў уладамі і інш.[4]

Лібералы сустрэлі Маніфест 17 кастрычніка з задавальненнем і прызналі мэты рэвалюцыі ў асноўным дасягнутымі. У падтрымку Маніфеста як асновы канстытуцыйнай манархіі выступілі правыя групоўкі буржуазіі, ліберальных памешчыкаў, земскіх дзеячаў, якія аб'ядналіся ў партыю "Саюз 17 кастрычніка" (акцябрысты). Левыя лібералы на з'ездзе ў Маскве ў кастрычніку 1905 г. абвясцілі пра заснаванне Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (з 1906 г. яна ўзяла назву партыя "Народнай свабоды"). Але прадстаўнікі ліберальных колаў (А.І.Гучкоў, М.М.Львоў, Н.А.Хамякоў і інш.) вырашылі выкарыстаць сітуацыю для распрацоўкі і прыняцця новага выбарчага закона. Распрацаваць праект даручылі Дз.М.Шыпаву і С.А.Катлярэўскаму.

У Царскім Сяле з 5 па 9 снежня таксама абмяркоўвалася пытанне аб новым выбарчым законе. Запрошаныя прадстаўнікі ад памяркоўнай грамадскасці А.Гучкоў і Дз.Шыпаў адстойвалі ўсеагульнае выбарчае права, але цар не пайшоў на змяненне заканадаўчых актаў ад 6 жніўня, а толькі згадзіўся дапоўніць іх. У выніку рабочыя атрымалі 206 месцаў выбаршчыкаў (3,4%), а ў гарадах права голасу — усе служачыя прыватных і дзяржаўных устаноў.

У разгар Снежаньскага ўзброенага паўстання Мікалай ІІ выдаў 11 снежня 1905 г. указ "Аб змяненні "Палажэння аб выбарах у Дзяржаўную думу", а таксама шэраг дадаткаў да яго, што пашырала кола выбаршчыкаў. Аднак захоўваліся ўсе галоўныя прынцыпы заканадаўчых актаў ад 6 жніўня: выбары заставаліся не ўсеагульнымі, не роўнымі і не прамымі. Да трох ранейшых курый дадавалася чацвёртая — рабочая. Але выбарчае права мелі рабочыя тых прадпрыемстваў, дзе колькасць працуючых мужчын ва ўзросце больш за 25 гадоў перавышала 50 чалавек, і рабочыя чыгуначных майстэрняў. Прадпрыемствы з колькасцю рабочых ад 50 да 1 000 чалавек выбіралі аднаго ўпаўнаважанага. На буйных заводах абіраўся прадстаўнік ад кожнай тысячы мужчын. Упаўнаважаныя на гарадскіх ці губернскіх сходах вылучалі выбаршчыкаў, якія потым удзельнічалі ў рабоце губернскіх сходаў па выбарах дэпутатаў Думы. Не атрымалі выбарчых правоў жанчыны, рабочыя, занятыя на дробных прадпрыемствах, у гандлі, на будоўлі, чыгунцы і інш. Колькасць рабочых, якія мелі

выбарчае права, вагалася па Гродзенскай, Віленскай, Мінскай і Магілёўскай губернях ад 10 да 15% ад іх агульнага складу. З 71 губерні Расійскай імперыі ў 21 рабочыя не мелі свайго прадстаўніцтва, у тым ліку і ў Віцебскай губерні, на той падставе, што колькасць "рабочага люду", якая там пражывала, у адносінах да ўсяго насельніцтва не давала ім магчымасці ўдзельнічаць у выбарах[5].

Такім чынам, у памешчыцкай курыі адзін выбаршчык прыпадаў на 2 тыс. землеўладальнікаў, у гарадской — на 4 тыс., у сялянскай — на 30 тыс., у рабочай — на 90 тыс. чалавек. У сялянскай курыі выбары заставаліся чатырохступеннымі. Сяляне мелі права выбіраць аднаго абавязковага дэпутата ад губерні. Не мелі выбарчых правоў бедната і батракі.

Паводле заканадаўчых актаў ад 6 жніўня і 11 снежня 1905 г., памешчыкі і буйная буржуазія мелі 54% месцаў выбаршчыкаў. У Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях на апошняй стадыі выбараў памешчыкам належалі 46% галасоў, сялянам — 38%, гараджанам — 16%. Па Расіі ў цэлым гараджане валодалі 22% месцаў выбаршчыкаў. Рабочыя фактычна пазбаўляліся прадстаўніцтва ў Думе, паколькі ў Беларусі прадпрыемстваў з колькасцю рабочых больш за 50 чалавек налічвалася толькі некалькі дзесяткаў.

У "Палажэнні аб выбарах у Дзяржаўную думу" былі раздзелы, прысвечаныя складу і структуры Думы, рэгламенту работы, пытанням яе кампетэнцыі, парадку справаводства і г. д. Дума склікалася на 5 гадоў, але імператар меў права датэрмінова яе распускаць з абавязковым прызначэннем новых выбараў. Тэрміны і працягласць пасяджэнняў Думы вызначаліся ўказамі імператара. Выдаткі на ўтрыманне ішлі за кошт казны. Членам Думы гарантавалася недатыкальнасць асобы, свабода думак па справах, якія абмяркоўваліся Думай, яны не былі абцяжараны справаздачамі перад выбаршчыкамі. Для пазбаўлення волі дэпутата патрабавалася папярэдняя згода Думы, калі толькі ён не быў затрыманы на месцы злачынства ці на наступны дзень.

Паводле закона ад 6 ліпеня 1908 г., дэпутатам было ўстаноўлена штогадовае забеспячэнне ў памеры 4 200 руб., якое выплачвалася штомесячна па 350 руб. У перыяд сесіі дэпутатам выплачвалі 10 руб. за працоўны дзень (члены Дзяржаўнага савета атрымлівалі 25 руб. за дзень)[6].

23 красавіка 1907 г., за некалькі дзён да пачатку работы Думы, Мікалай II зацвердзіў тэкст новай рэдакцыі Асноўных дзяржаўных законаў Расійскай імперыі. Такая паспешнасць была звязана з імкненнем не дапусціць іх абмеркавання ў Думе, каб апошняя не ператварылася ва Устаноўчы сход. "Устанаўленне Дзяржаўнай думы" і "Устанаўленне Дзяржаўнага савета" былі ўключаны ў тэкст Асноўных законаў. Яны зацвярджалі самадзяржаўнае ўладкаванне Расійскай імперыі, рускую мову як дзяржаўную, парадак прыняцця законаў, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці цэнтральных дзяржаўных інстытутаў[7].

У сувязі з першымі выбарамі ў Дзяржаўную думу разгарнулася барацьба партый і груповак рознай ідэалагічнай і палітычнай арыентацыі за ўплыў на народныя масы і галасы выбаршчыкаў. Многія партыі і іх органы друку былі ўтвораны ў самы разгар выбарчай кампаніі і рабілі першыя крокі на палітычнай арэне. Актыўную дзейнасць у Беларусі распачалі прадстаўнікі мясцовай буржуазіі і памешчыкаў, якія падзяліліся па нацыянальнай прыналежнасці. Рускія памешчыкі і чыноўнікі, праваслаўнае духавенства далучыліся да партыі "Саюз 17 кастрычніка". Яны выступалі абаронцамі інтарэсаў самадзяржаўя на ўскраінах пад лозунгам: "Адзіная і непадзельная Расія". Блізкімі да іх былі "Саюз рускага народа", іншыя партыі і групоўкі. Ролю агітатара і арганізатара "истинно русских" у Беларусі ўзяла газета "Окраины России". На выбарах яны пацярпелі паражэнне.

Польскія памешчыкі выступалі за далучэнне Беларусі і Літвы (Прывіслінскага краю) да Польшчы на правах аўтаноміі. Вялікі ўплыў на каталіцкае насельніцтва Віленскай і Гродзенскай губерняў мела Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі. Частка буйных памешчыкаў Беларусі абвясціла сябе прыхільнікамі кадэтаў, паколькі іх задавальняла праграма апошніх і лозунг "права нацый на самавызначэнне". У той жа час яны не падтрымлівалі кадэтаў у аграрным пытанні, абаранялі прынцып недатыкальнай прыватнай уласнасці на зямлю і не згаджаліся нават з частковым адчужэннем зямлі па "справядлівай ацэнцы". Кадэты ў асноўным дзейнічалі праз нацыянальныя групы польскіх, яўрэйскіх, літоўскіх арганізацый. Яны мелі моцную апору ў асяроддзі яўрэйскай буржуазіі і выступалі ў блоку з "Саюзам дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі".

Бальшавікі агітавалі за актывізацыю рэвалюцыйнай барацьбы і байкатавалі выбары. Гэта тактыка мела поспех сярод рабочых, сяляне ў асноўным прынялі ўдзел у выбарах. Байкатаваў выбары і Бунд. Ухіліліся ад выбарчай кампаніі народніцкія партыі — Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэры) і Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). Але ва ўмовах адступлення рэвалюцыі байкот не ўдаўся, выбары адбыліся.

Ад беларускіх губерняў дэпутатамі Дзяржаўнай думы 1-га склікання — першага расійскага парламента — сталі 36 чалавек: 13 сялян, 11 інтэлігентаў, 8 памешчыкаў, 2 ксяндзы, епіскап, рабін. З іх 29 прайшлі ў Думу пад кадэцкімі лозунгамі пры падтрымцы Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі, сіяністаў і "Саюза дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі". З 7 астатніх дэпутатаў 5 адносілі сябе да беспартыйных, адзін — да сацыял-дэмакратаў і адзін — да правых[8].

Безумоўна, саслоўны і партыйны склад дэпутатаў не адлюстроўваў рэальнай грамадска-палітычнай сітуацыі ў 5 заходніх губернях, паколькі шэраг уплывовых партый байкатавалі выбары. Беларускія губерні, як і большасць губерняў імперыі, паслалі ў Думу кадэтаў і беспартыйных сялян (якія затым у большасці апынуліся "лявей кадэтаў", у складзе

"трудавой групы"). Правыя прайшлі ў выключных выпадках. Вынікі выбараў у першую Дзяржаўную думу не задавальнялі ні органы ўлады, ні манархістаў, ні лібералаў.

27 красавіка 1906 г. у Георгіеўскай зале Зімняга палаца Мікалай II выступаў з кароткай прамовай перад дэпутатамі Думы. На першым пасяджэнні з 523 дэпутатаў, якія павінны былі быць абраны па закону, прысутнічалі толькі 436, у асноўным з цэнтральных і заходніх губерняў. На нацыянальных ускраінах выбары зацягнуліся да чэрвеня 1906 г. Старшынёй Думы 426 галасамі быў абраны прысяжны паверaны пры Маскоўскім акруговым судзе, былы прарэктар Маскоўскага універсітэта кадэт С.А.Мурамцаў, яго таварышамі (намеснікамі) таксама кадэты — князь П.Д.Далгарукаў і прафесар М.А.Грэдэскул.

Цэнтральным пытаннем, на якім засярoдзілі ўвагу дэпутаты, было аграрнае. Ад землеўладальнікаў Беларусі і Літвы выступіў епіскап барон Э.Ю.Роп. Ён выклаў дэпутатам асноўныя падыходы польскіх памешчыкаў да аграрнай рэформы, адзначыў, што "сялянскае пытанне не можа аднолькава вырашацца ў розных мясцовасцях імперыі, а жаданне набыць больш зямлі не павінна парушаць чужыя правы"[9]. Пазіцыю Э.Ропа падтрымаў князь Е.Э.Друцкі-Любецкі. Ён прапанаваў у праекце рашэння па аграрным пытанні пасля слоў аб адчужэнні часткі прыватнаўласніцкіх зямель дадаць: "адпаведна з патрэбамі і пажаданнямі мясцовага насельніцтва"[10]. Дума адхіліла гэту папраўку. Пра неабходнасць усебаковага рэгулявання зямельных адносін на месцах заяўляў дэпутат ад Віленскай губерні Б.А.Ялавецкі[11]. Была адхілена прапанова ксяндза з Пружан А.М.Сангайлы вырашыць аграрнае пытанне "адпаведна з мясцовымі ўмовамі", а прынята дапаўненне — "у выпадку неабходнасці прыступіць да прымусовага адчужэння"[12].

8 мая на разгляд Думы за подпісамі 42 кадэтаў быў унесены "Законапраект асноўных палажэнняў аграрнай рэформы". Яны прапанавалі стварыць "дзяржаўны зямельны запас" з казённых, манастырскіх, царкоўных і часткі прыватнаўласніцкіх зямель, якія здаваліся ў арэнду ці зусім не апрацоўваліся. Гэтыя землі падлягалі прымусоваму адчужэнню на аснове выкупу па "справядліваму" (не рынaчнаму) кошту[13]. Пытанне аб тым, хто будзе праводзіць рэформу, у законапраекце не ўзнімалася.

За подпісам 104 дэпутатаў 23 мая трудавікі падалі свой "Праект асноўных палажэнняў зямельнага закона". Яны патрабавалі нацыяналізаваць зямлю, ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне. Казённыя, удзельныя, кабінецкія, манастырскія і царкоўныя землі павінны былі перайсці ў агульнанародны фонд, а сялянскія землі ў межах працоўнай нормы, на думку трудавікоў, застацца ў сялян на правах прыватнай уласнасці. Права распараджацца зямлёй перадавалася мясцовым зямельным камітэтам, якія павінны выбірацца ўсеагульным, прамым, роўным і тайным галасаваннем[14].

Эсэры не пагадзіліся з трудавікамі наконт прыватнай уласнасці і ў праекце 33-х прапанавалі ў якасці першачарговай задачы адмяніць прыватную ўласнасць на зямлю, аб'явіць яе агульнанароднай уласнасцю і перадаць у распараджэнне цэнтральных і мясцовых органаў самакіравання.

Дэпутаты-памешчыкі Беларусі абаранялі прынцып недатыкальнасці прыватнай уласнасці і выказаліся за вырашэнне аграрнага пытання аўтаномна ад іншых рэгіёнаў імперыі. Р.А.Скірмунт выступіў супраць адчужэння памешчыцкіх зямель, спасылаючыся на тое, што гэта выкліча вялікія выдаткі і неспрыяльна адаб'ецца на становішчы дзяржавы. Памешчык Б.Ялавецкі, барон Э.Роп, ксёндз А.Сангайла, падтрымаўшы Р.Скірмунта, вырашэнне аграрнага пытання звязвалі з пытаннем аб аўтаноміі Беларусі.

Асцерагаючыся рэвалюцыйнага ўздзеяння думскіх дэбатаў, асабліва па аграрным пытанні, цар 8 ліпеня 1906 г. распусціў Дзяржаўную думу і катэгарычна выказаўся за захаванне прыватнай уласнасці на зямлю. Дзяржаўная дума 1-га склікання (I Дзяржаўная дума) была абвешчана Мікалаем II крамольнай. Дэпутаты абвінавачваліся ў тым, што ўхіляліся ад заканадаўчай працы, імкнуліся ў абход цара змяніць Асноўныя законы краіны і вырашыць аграрнае пытанне.

У пачатку 1907 г. ва ўмовах масавых рэпрэсій і спаду рэвалюцыйнай актыўнасці мас пачаліся выбары ў Дзяржаўную думу 2-га склікання (II Дзяржаўную думу). Расклад палітычных сіл у параўнанні з першай выбарчай кампаніяй у Беларусі істотна змяніўся на карысць правых. У кастрычніку 1906 г. у Вільні акцябрысты і чарнасоценцы аб'ядналіся ў "Рускі ўскраінны саюз" ("РУС"), органам друку якога ў ліку іншых стала і газета "Окраины России" (Санкт-Пецярбург). Перавага правых выявілася ўжо на першым этапе выбараў. Калі па губернях Еўрапейскай Расіі да правых партый належалі толькі 10% сялянскіх упаўнаважаных, а да апазіцыйных груп — 60%, то ў заходніх губернях працэнт вагаўся ад 20 да 60. Асабліва высокі ён быў у Мінскай і Магілёўскай губернях. Уплыў мясцовых правых і акцябрыстаў на другім этапе сялянскіх выбараў быў яшчэ больш відавочны. Пры падтрымцы мясцовай адміністрацыі, праваслаўных святароў і беларускага заможнага праваслаўнага сялянства ў Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай губернях "РУС" правёў у Думу 15 дэпутатаў[15].

Кадэты і яўрэйскія камітэты захавалі свае пазіцыі ў гарадах. Гарадская курыя дала каля 80% ліберальна і апазіцыйна настроеных выбаршчыкаў. Але колькаснае засілле правых выбаршчыкаў на губернскіх выбарчых сходах дазволіла правесці ў II Думу толькі двух кадэтаў ад заходніх губерняў.

Польска-беларускія памешчыкі заваявалі 10 месцаў. 8 дэпутатаў-сялян, якія аб'явілі сябе беспартыйнымі, у Думе сталі на бок правых[16].

У той жа час выбары па Еўрапейскай Расіі ў цэлым закончыліся перамогай левых партый (атрымалі 222 месцы ў Думе).



Год други. Вильня 11 лютаго (февраля) 1907 г. № 6.

# Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысунками

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.

Адрас редакціи и администраціи: Вильня, Завальная вуліца, дом № 45.

*Вильня 11 лютаю (февраля).*

Яя видна з тэлеграм аб выбарах, у Расеи праходзяць у Думу болей людзи, што стаяць за народную свабоду и социалисты, у нашай Беларусии, на Волыни, западнай Украйне и Польшчы прайшли найболи люди, што не стаяць за свабоду и лепшую долю працуючаго народу: павыбирали у Думу памешчыкаў, чорнасоценникоў, духоўных. Только у Коўне, гдзе мужыки павыбирали ад валасцей и вуездоў выбаршчыкоў абразованых и сведомых только там натрафили пакиравацца у губернии мудра и цьвёрда и паслали усих дэпутатоў, што будуць цьвёрда стаяць за ўсю волю и за ўсю землю. У беларуских губерниях памешчыки, біскупы и архирэи—лёгка пазбивали з толку наших вёсковых людзей. А на вуездных выбарах было з каго выбираць, але на гэтых выбарах мужыки кепска выбирали, усё больш гаспадароў, а не таких што панимаюць палитыку. Тым часам у гэтым гаду ўсе вораги мужыкоў добра нарыхтавалися (саргапизавалися). Будзе нам навука на други раз!

## Выбары.

— о —

**Выбары у Вильни.**

Каб аписаць, як прайшли у нас выбары ў Думу ад Виленскай губ., прыпомним, што памешчыцких выбаршчыкоў палагаецца на нашу губернию 44, мужыцких 40, гарадских 7 и адзин рабочы. Ня будзем гаварыць аб тым, якая тут справедливосць, што мильён мужыкоў мусиць менш пасылаць выбаршчыкоў, як кучка памешчыкоў. Скажэм пра самые выбары. У числе памешчыцких выбаршчыкоў были біскуп Рооп и ксёндз Родаевич, што надбиваў Ошмянских выбаршчыкоў каб выбирали паноў и ксяндзоў. Ад мужыкоў двое не прыехали саўсим: Кобанк Свенцянскаго вуезду и Козлевич Троцкаго, так што у мужыкоў сила наменшылась на два голасы, и усяго мужыцких выбаршчыкоў асталося 38. З гарадоў было 6 жыдоў и адзин хрысциянин. Выбаршчык-рабочы сядзеў ў турме, але на выбары яго мусили выпусциць. Памешчыцких, а затым мужыцких выбаршчыкоў было найбольш. И адным и другим хацелася, каб правесци ў Думу сваих. Каб не было семи гарадских выбаршчыкоў, дык памешчыки мала с ким и гаварыли-бы. Маючы голасоў больш, як мужыки, яны правили бы ўсеньких сваих. Але тут напаў на их страх, каб мужыки не злучылися з гарадскими, бо тагды мужыки пераважылиб их и не прапусьцили бы ни воднаго намешчыка. Вотож дасля гэтага перад выбарами адзин багаты памешчык Корвин-Милеўски прасиў жыдоўскаго выбаршчыка Бака кинуць мужыкоў и прылучыцца да памешчыкоў, каторые абяцали за гэтас выбраць ў Думу двох жыдоў. Тагды памешчыки правели бы, акром двох жыдоў, яшчэ трох сваих, а мужыком асталося бы выбраць аднаго дэпутата, каторага яны и так мусяць выбраць па закону, апроч другиx. Але жыды адказалися ад такого гандэлю. Яны згаварылися злучыцца з мужыками и падаваць за их кандыдатоў голасы и вот и ў таким разе, кали мужыки не захочуць правесьци



Год други. Вильня 24 лютаго (февраля) 1907 г. № 8.

# Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысунками

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.

Адрас редакціи и администраціи: Вильня, Завальная вулица, дом № 45.

Абъяўления прынимаюцца на наследней страницы па 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукаписы и корэспонденции, прысланные у редакцию, мусяць быць чытательна написаны з праудзивою фамильею и адресом таго, хто их прысылае. ... Адрас и фамилия только для ведама редакции.

*Вильня 24 лютаю (февраля).*

Аткрылась Гасударственая Дума. Увесь народ с гарачэй надзеею чэкае ад сваих прэдставицелёў асвабаджэння ад цяжкаго, крываваго туману, што завалок увесь край.

Дума адкрылася циха без „парада". Чыноўницкие правицельства ни мае чаго радавацца, только для народу гэта вяликая свята. гэта Дума—адзин крок далей па дарозе да народнай свабоды. Нихай же гэта Дума будзе наша; будзем падтрымываць нашых дэпутатоў у их цяжкай вайне за справу працуючаго народа. Будзем пасылаць наказы з сваими трэбованнями, ды хадакоў, каб Дума знала, якие у нас патрэбы и ведама якие для нас патрэбны законы и парадки. С шчырай верай, што новая Дума разам с усим нарадам крок за крокам дабьецца поўных правоў народу, витаем народных дэпутатоў и жычым им смелосци и мудросци у их святой працы.

## Адкрыцце Гасударственной Думы.

20 февраля с 11 гадзины дня дэпутаты и публика стали сабирацца ў Таурыческим палацы. Роўно ў час и 3 минуты дня сэнатор Галубев, што сядзеў на председацельским месцы, устаў и низка пакланиўся дэпутатам ўперад, ўправо и ўлево. Гасударственны сэкрэтар прочытаў, по запрошанию Галубева, царски указ, гдзе цар объяўляець, што ё поручаець адкрыць Думу Галубеву, Пасьля гэтага Галубев пачаў чытаць па записци, гдзе гаварылася, што цар витаець новую Думу. Только ўспамянуў Галубев аб цару, як дэпутат ад Бесарабскай губ. Крупенски, правы (што стаяць за старые парадки), закрычаў: „Нехай здраствуець Гесударь — Император!" Астальные правые крыкнули: „Ура!" и ўстали. Але правых ўсяго маленькая кучка. Акром их, ўсе дэпутаты сядзели и маўчали. Потым дэпутаты мусили падписацца пад тою прысягаю, каторую министры кались дзеля гэтага составили. Начали выбираць председацеля. Не считаючы кучкки правых, ўсе падали сваи голасы за Головина. Як гасударственны сэкрэтарь, прочитаў што выбран Галовин, ўсе, акром правых, забили ў далони. Галовин падняўуся на прадседацельскаё месцо, и Галубев сустрэў яго паклонам. Галовин пакланиўся Думе и сказаў: „Хаценне Думы для кожнаго яе члена — закон. Помнячы гэта, я незадумываючыся прымаю обязанасьци прэдседацеля дадзеныя мне вами. Я зраблю ўсё, што магу, абы спраудзиць ваши надзеи. Ня гледзячы на тые пракопания, што нас раздзеляюць. мы можэм зъедниицца на констытуцыйным грунце пры рабоце на дабро страны... Мы добра ведаем, з яким нецерпением ждзець наша страна ад Думы аблегчэния цяжких пакут. Простая дарога дзеля гэтай задачы намечэна першай Думай. Яна застанецца гэтакоюж и ў цеперашни час: трэба правясьци ў жыцё констытуцию абецаную нам 17 акцябра и социальные законы. Мы зробили ўсё, каб Дума гэтага дабилася. Моцная народная Дума, раз сазваная, не памрэць. Зъеднинўшыся з манархам, яна без задзержки

Падчас выбарчай кампаніі ў II Дзяржаўную думу 10 лістапада 1906 г. кіраўнікі БСГ пачалі выдаваць у Вільні новую, больш памяркоўную ў параўнанні з "Нашай доляй" газету "Наша ніва". Браты І.І. і А.І. Луцкевічы разам з А.М.Уласавым узначалілі рэдакцыю газеты, якая стала "генеральным штабам" усяго беларускага адраджэнскага руху. У першым яе нумары быў змешчаны артыкул "Выбары ў Дзяржаўную думу", з якога вынікала, што вырашэнне важнейшых сацыяльна-эканамічных пытанняў "Наша ніва" звязвала не з рэвалюцыяй, а з Дзяржаўнай думай[17]. "Дума не ашукае народ, — пісала газета ў наступных нумарах, — яна ўсё зробіць, каб споўніць народныя жаданні", бо "... увесь народ, змучаны небывалым уціскам, чакае, што Дума дасць свабоду, лепшыя парадкі, зямлю, паложыць канец крыўдзе народнай"[18].

На старонках "Нашай нівы" падкрэслівалася значэнне I Дзяржаўнай думы, якая "назначыла многа новых законаў і пачала іх апрацоўваць, але яе разагналі і не далі скончыць гэтую работу"[19]. Вялікія надзеі ўскладваліся на новую Думу. Рэдакцыя найперш акцэнтавала ўвагу на тым, каб ад Беларусі ў расійскі парламент трапілі сапраўдныя абаронцы працоўных. 22 снежня 1906 г. газета надрукавала наказ, які, па сутнасці, з'яўляўся праграмай паляпшэння становішча малазямельных і беззямельных сялян. Дэпутаты павінны былі змагацца ў Думе за скасаванне тых законаў, якія не дазвалялі свабодна купляць і прадаваць зямлю; ліквідацыю ("без крыўды для працуючых") цераспалосіцы, так званых шнуроў, і сервітутаў праз стварэнне фальварковых або хутарскіх гаспадарак; увядзенне мясцовага самакіравання ў валасцях, паветах і губернях і асобнага сейма для Беларусі, абранага ўсеагульным, роўным, тайным і прамым галасаваннем; адмену ўскосных падаткаў ці ўстанаўленне адзінага прагрэсіўнага падаходнага падатку; увядзенне ўсеагульнай абавязковай бясплатнай адукацыі з забеспячэннем права і магчымасці вучыцца на роднай мове[20].

Выбарчую кампанію ў Думу "Наша ніва" называла "передвыбарнай вайной", якую развязалі мясцовыя "истинно-русские" і "истинно-польские" людзі. З нумара ў нумар газета пісала, што "истинно-русские" ўзурпіруюць уладу, нацкоўваюць рускіх на яўрэяў і палякаў, сілаю імкнуцца пасварыць усіх і, "прыдушыўшы кожны народ паасобку, увесці панаванне багацеяў і чыноўнікаў над усімі краямі, што да Расіі належаць". Падагульняючы шматлікія допісы з месцаў, "Наша ніва" паведамляла, як правыя ашуканствам і абяцаннямі надзяліць зямлёй імкнуцца перацягнуць мужыкоў у свой лагер[21]. Так, з Навагрудскага павета пісалі, што чарнасоценныя газеты, такія, як "Россия" і "Минское слово", "то поп у царкве раздае, то пісар у валасці". Але сяляне гэтых газет не чыталі, паколькі ў іх "не пісалі аб неабходнасці надзялення сялян зямлёй"[22].

У красавіку 1907 г. у Вільні з'явілася яшчэ адна крайне правая газета — "Морская волна". Карэспандэнты "Нашай нівы" паведамлялі, што "истинно-русские" ездзяць па вёсках, раздаюць "Морскую волну" і падманам, што яны стаяць за сялян, запісваюць іх у свой саюз. "Такой бессаромнай газеты, як "Морская волна", — пісала "Наша ніва", — у Вільні яшчэ не было. Яна цкуе адзін народ на другі, абвінавачвае ўсіх, хто хоць крыху стаіць за праўду"[23]. Газета тлумачыла губернскім сялянскім выбаршчыкам, каб не выбіралі ворагаў беларускага народа, бо "... інакш чорныя сотні і ворагі народнай свабоды запануюць над усім нашым краем"[24].

Літаральна з першага нумара "Наша ніва" выкрывала дзейнасць у Беларусі польскіх нацыяналістаў, якія "сеялі сварку і нянавісць паміж праваслаўнымі і каталікамі беларусамі". "І ў выніку, — канстатавала газета, — няма адзінства сярод беларускіх сялян: адны пайшлі да "истинно-русских", другія — да "истинно-польских" людзей. А розніца паміж імі тая, што адны цягнуць у бок Масквы, другія — у бок Варшавы, а ўсе разам імкнуцца захапіць у свае рукі цёмны народ наш ды спакойна абдзіраць яго"[25].

"Наша ніва" звярталася да сялян, якія мелі права ўдзельнічаць у выбарах, не паддавацца на агітацыю велікарускіх шавіністаў і польскіх нацыяналістаў, а таксама тых, хто іх падтрымліваў у заходніх губернях. На думку мясцовых карэспандэнтаў газеты, будучыя дэпутаты ад Беларусі павінны наведваць валасці і паветы, праводзіць сходы і "аб'яўляць, што яны будуць рабіць у Думе, а таксама час ад часу дасылаць лісты выбаршчыкам".

У ходзе выбарчай кампаніі кіраўнікі БСГ заклікалі сялянскіх выбаршчыкаў падтрымліваць "мужыкоў-сацыялістаў", яднацца з гарадскімі выбаршчыкамі і не прапускаць у Думу памешчыкаў. У нумары ад 25 студзеня 1907 г. газета з задавальненнем паведамляла, што выбаршчыкі па валасцях выбіраюць прагрэсіўных людзей, "мужыкоў-сацыялістаў — людзей разборлівых, якія добра разумеюць, якой дарогай неабходна крочыць, каб весці народ да свабоды і справядлівых парадкаў"[26].

"Наша ніва" выступала супраць заяў чарнасоценцаў, што яўрэі жывуць і багацеюць за кошт працоўнай беднаты, не раз пісала пра цяжкае становішча яўрэйскіх рабочых і рамеснікаў у гарадах і мястэчках, адзначала, што "яўрэі, за выключэннем жмені багацеяў, жывуць яшчэ горш, і наша працоўная беднота павінна не "граміць" яўрэйскіх бедалаг-рабочых, а разам з імі дабівацца лепшага жыцця". Яна заклікала выступаць адзіным фронтам на выбарах супраць памешчыкаў, "лепш пасылаць у Думу яўрэя з галавой, чым безгаловага хрысціяніна, хоць і дзядзьку роднага"[27].

Газета вітала дэпутатаў ад Беларусі, абраных у Дзяржаўную думу 2-га склікання, і выказвала спадзяванні, што частка сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі, якая прайшла ад правых партый, далучыцца да трудавікоў і будзе плённа дзейнічаць у інтарэсах працоўных.

Рэгулярна змяшчаліся на старонках "Нашай нівы" вытрымкі з прамоў трудавікоў, кадэтаў, сацыял-дэмакратаў, выбраных ад іншых рэгіёнаў Расіі. "Але аб нашым краі, — пісала "Наша ніва", — не ўпамянуў ні адзін дэпутат. Ніхто не сказаў аб тым, як цяжка жывецца народу ў Беларусі, што неабходна для нашага краю". Газета крытыкавала паводзіны сялянскіх дэпутатаў ад Мінскай губерні В.М.Мельніка і П.Ф.Грудзінскага, якія пайшлі за правымі, і бяздзейнасць гродзенскіх дэпутатаў. Яна паведамляла, што дэпутаты ад Украіны аб'ядналіся ва "ўкраінскую трудавую грамаду", выдаюць газету і падтрымліваюць цесныя сувязі са сваімі выбаршчыкамі. "А нашы? — абуралася газета, — не маюць нічога агульнага з тымі людзьмі, хто паслаў іх у Думу пастаяць за наш край"[28].

24 лютага 1907 г. "Наша ніва" надрукавала артыкул "Зямельная справа ў Новай Зеландыі", у якім акцэнтавала ўвагу, што там зямлёй распараджаецца Рада, абраная агульным, прамым і тайным галасаваннем без падзелу па полу, нараднасці і веравызнанні. Тут жа быў змешчаны артыкул "Дума і народ", дзе фактычна праводзілася параўнанне паўнамоцтваў членаў Рады ў Новай Зеландыі і дэпутатаў расійскай Дзяржаўнай думы. "Наша ніва" падводзіла чытачоў да разумення неабходнасці заваёвы ўлады народам і перадачы яе Народнай Радзе, у складзе якой не павінна быць цара, міністраў, членаў Дзяржаўнага савета[29].

Можна канстатаваць, што выбарчая кампанія ў Дзяржаўную думу 2-га склікання грунтоўна асвятлялася на старонках "Нашай нівы". Супрацоўнікі рэдакцыі і карэспандэнты з месцаў прыкладалі намаганні для таго, каб беларускае сялянства зрабіла правільны выбар пры вылучэнні ўпаўнаважаных і выбаршчыкаў, не прапускала ў іх лік "истинно-русских" і "истинно-польских" людзей, асабліва памешчыкаў. Газета заклікала яднацца на выбарах з гараджанамі. На старонках "Нашай нівы" друкаваліся шматлікія "прыгаворы" сялян, накіраваныя ў Дзяржаўную думу. Вось тэкст аднаго з іх: "Мы, што ніжэй паставілі подпісы, 35 сялян Сычоўскага сельскага таварыства, Брэсцкага павета, Гродзенскай губерні 17 красавіка на сельскім сходзе пастанавілі: 1) мы ад шчырага сэрца верым Дзяржаўнай думе; 2) калі наступіць час, падтрымаем яе ўсімі нашымі сіламі". Такі ж "прыгавор" паслалі ў Думу 29 сялян Стаўскай сельскай грамады таго ж павета[30].

Абраная на аснове заканадаўчых актаў ад 6 жніўня і 11 снежня 1905 г. II Дзяржаўная дума аказалася яшчэ больш "непаслухмянай", чым першая. Памяркоўныя пазіцыі займалі толькі кадэты. Але іх праграму рэфармавання краіны мірным шляхам не падтрымалі ні правыя, ні левыя. Правыя партыі патрабавалі разгону Думы. Улічваючы спад рэвалюцыйных выступленняў рабочых і сялян (у параўнанні з 1905 і 1906 гг.) і расчараванне народных мас вынікамі работы Думы, Мікалай II 3 чэрвеня 1907 г. падпісаў указ пра яе роспуск. Адначасова быў надрукаваны


Год други. Вильня 8 (21) юня 1907 г. № 22.

# Наша Нива

Перша Беларуская Газэта з Высункама

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.

Адрэс радакціи и администрацiи: Вильня, Завальная вулица, дом № 30.

## Именны Высочайшы Указ

Правицельствуючаму Сэнату.

У Сэнат 3 юня пaступиў вось яки царски указ:

„Апираючыся на 105 стацью Свода Асноўных Гасударственых Законоў (выд. 1906 г.), прыказываем:

1) Гасударственую Думу распусьциць;

2) новые выбары членоў Думы зрабиць, пачынаючы ад 1 сенцября;

3) зноў выбраную Гасударственую Думу сазвать 1-го ноября гэтаго 1907 года.

Дзеля спаўнення гэтаго Сэнат мае зрабиць патрэбнае распараджэнне".

*Вильня 8 (21) чэрвеня (юня).*

Царским прыказам Гасударственая Дума ўжо распущэна. Надоўгае жыцце не скончылося; ўсяго адбылося 53 заседання.

Правицельства прызнала, што Дума не може працавать с карысцью для дзержавы Расейскай. Думу виноватыць Манифест ў тым, што яна або саўсим не разглядала важных праектоў, або разглядала марудна ды адменяла их. Дума скасавала законы, каторые мели караць за пахвалу праступлений и накладаць большую кару за бунтаванне войска; не прыстала и на тое, каб аганиць усе забиццв и гвалты. „Гасударственай росписи" даходоў и расходоў, што прыгатавала правицельства, Дума дагэтуль не зацьвердзила. Запросами дэпутаты проста вали вайну проци правицельства ды адбивали у народу веру ў яго.—А ешчэ судзебные власьци заявили, што часць Думы мелася збурыць цяперашни парадак у гасударстви и царскую власць. А як правицельства патрэбовала выдалиць з Думы 55 дэпутатоў да суда, ды 16 з их даць арыштаваць, то Дума не споўнила ў той жэ момэнт жадання власьцей.

За ўсё гэта, пишецца ў манифесьци, Думу и распусьцили.

Прычыну паступкоў Думы манифест знаходзиць ў тым, што цяперашни закон аб выбарах непрыгодны, дык и непрыгодные людзи папали ў дэпутаты. Дзеля таго устаноўлены новы парадак выбароў. Новая Дума мусиць мець дух расейски: ў ёй будзе гэтульки дэпутатоў ад иншых народнасьцей, што да Расеи належаць, каб яны не магли станавиць аб справах расейских. Яны ма-


Год други. Вильня, 10 (23) листапада 1907 г. №. 33.

# Наша Нива

Беларуская газэта.

Выходзиць раз у тыдзень польскими и рускими литэрами.

Адрэс радакціи и администрацiи: Вильня, Завальная вулица дом № 30.

Ад радакцыи. Друкарня Кухты, гдзе друкавалась „Наша Нива", на нейки час закрыта гэнэрал-губернатаром. У другой друкарни нима усих патрэбных литэр; нехай чытацели выбачаюць за абмылки у газэци и за тое, што яна спазьнилася.

## ТРЭЦЯЯ ДУМА

Пра Першую Думу казали, что гэта была Дума гнева народнаго; Другая Дума была мужыцкая; пра цяперашнюю Думу можна сказаць, што яна больш дваранская, памешчыцкая и духоўная.

И праўды: у Думе цапер усяго дэпутатоў 437, а адных дваранoў, памешчыкоў меж ими 219, духоўных—48 (у тым шчоци (архирэи); мужыкоў тольки 87 чал., мешчан—30, „разночынцоў" и казакоў—53.

И часам у Другой Думе мужыцких дэпутатоў было 196.

У новай Думе найбольш „правых" дэпутатоў: „саюза 17 акцябра", манархистоў, „саюза русскаго народа" и „окраиннаго саюза" (у гэтым камандуе вядомы усим министр Пмид). Правых больш паловы—279 чал., и яны—главные гаспадары у Думе: Дума у их руках.

Да „оппозыции" (да „левых") належыць усяго 135 дэпутатоў, у тым счоце социал-дэмакратоў—16, проста левых—9, трудавикоў—7, партии „народнай свабоды"—48, мусульманоў—6, польскаго кола—16, розных беспартыйных прогрэсистоў—33.

Увесь „прэзыдиум"—правы. На прадседацеля Думы правые выбрали „акцябриста" Хомякова, памешчыка Смаленской губ.; нейки час йон служыў чыноўникам у Пецербургу. На таварыша прадседацеля справедливейшые с-памеж акцябристоў хацели выбраць ка-дэта (з партии „народной свабоды") Маклакова, але гэта не удалося: выбраны были член „союза русскаго народу"—князь Волконский и акцябрист барон Майендорф, немец.

Чаго може чакаць народ ад „правай" Думы?

Адказ на гэтае пытанне можна ужо цапер знайсьци у „дэкларации" партии „17 акцябра" (акцябристоў). Вось што пишецца у дэкларации.

„Главнае заданне партии—зрабиць у Думе „большынство": яно не захоча, каб министры назначалися з яго членоў... и аддавали атчот Думе... „так пачынаецца дэкларация. Гэта значыць: акцябристы хочуць мець найбольшую силу и недапусьциць, каб министры назначалися з найбольшэй Думскай партии дый залежали ад Думы.

Аб новым выбарным законе, па катораму выбиралася Трэцяя Дума, акцябристы кажуць, што йон добры, менять яго ня трэба (хаця йон адабраў права выбираць ад вялікай часьци народа).

новы выбарчы закон па выбарах у Дзяржаўную думу 3-га склікання, які ішоў у разрэз з Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. і Асноўнымі законамі Расійскай імперыі. Такім чынам, царызм ажыццявіў так званы трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот, які азначаў паражэнне рэвалюцыі 1905—1907 гг. і часовую перамогу сіл контррэвалюцыі.

Палітычная сітуацыя ў краіне рэзка змянілася, што адбілася на ходзе і выніках выбараў. Манархічныя партыі, праваслаўнае духавенства ставілі сабе за мэту ўнесці раскол паміж сялянствам, рабочымі, дэмакратычнымі слаямі гараджан, для чаго выкарыстоўвалі лозунгі вялікадзяржаўнага шавінізму і антысемітызму. Найбольш актыўна яны дзейнічалі ў Беларусі, Літве, Украіне. У 15 губернях так званай мяжы яўрэйскай аселасці налічвалася каля 60% усіх членаў "истинно-русских" арганізацый.

Ва ўмовах палітычнай рэакцыі выбарчую кампанію ў Беларусі ўзначалілі "Саюз рускага народа", "Рускі ўскраінны саюз", праваслаўныя брацтвы, якія выступалі пад лозунгам "Расія для рускіх і руская павінны кіраваць!". Абапіраючыся на падтрымку мясцовых органаў улады, яны вялі барацьбу супраць дэмакратычных і ліберальных партый (у першую чаргу кадэтаў) і газет, а таксама тых арганізацый, якія з'яўляліся выразнікамі інтарэсаў польскіх памешчыкаў і яўрэйскай буржуазіі. Пэўным уплывам сярод насельніцтва Заходняй Беларусі і Літвы ў 1907—1908 гг. карысталіся Краёвая партыя Літвы і Беларусі, каталіцкае духавенства. Яны імкнуліся павесці пад сваім сцягам беларускіх сялян-католікаў і дамагчыся палітычнага панавання ў краі шляхам арганізацыі земстваў згодна Палажэнню 1890 г.

У адпаведнасці з выбарчым законам ад 3 чэрвеня 1907 г. памешчыцкая курыя атрымлівала 51% выбаршчыкаў Еўрапейскай Расіі, у тым ліку ў Мінскай губерні 51,2% выбаршчыкаў, у Віленскай — 48%, у Віцебскай — 45,3% і ў Гродзенскай губерні — 41,1%[31]. Паніжаны працэнт выбаршчыкаў ад землеўладальнікаў у Віцебскай, Віленскай і Гродзенскай губернях устанаўліваўся ўрадам з мэтай абмежаваць прадстаўніцтва польскага дваранства ў Думе. Акрамя таго, у Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях сходы землеўладальнікаў, а ў Мінскай губерні і сходы гарадскіх курый праводзіліся па нацыянальнаму прынцыпу. Праваслаўныя беларусы пры гэтым далучаліся да "рускай", а католікі — да "польскай" курый.

Наступленне рэакцыі прывяло да згортвання дзейнасці бундаўцаў. Фактычна адмовіліся ад удзелу ў выбарах эсэры. БСГ спыніла нелегальную дзейнасць, актывісты і прыхільнікі партыі згуртаваліся вакол газеты "Наша ніва".

1 верасня 1907 г. пачаліся выбары ў заходніх губернях. Дробныя землеўладальнікі не праяўлялі значнай актыўнасці, бо не разлічвалі перамагчы на

павятовых сходах поўнацэнзавікоў (буйных памешчыкаў, якія валодалі правам напрамую абіраць выбаршчыкаў на губернскі выбарчы сход). На апошніх і быў разлічаны новы выбарчы закон. Землеўладальнікі выбіралі 283 выбаршчыкі, у той час як па закону ад 11 снежня 1905 г. — 246. Павелічэнне колькасці выбаршчыкаў было неаднолькавае па паветах. У тых, дзе "польскае" землеўладанне перавышала, колькасць выбаршчыкаў зменшылася і адпаведна павялічылася там, дзе пераважала "рускае".

З 283 выбаршчыкаў ад землеўладальніцкай курыі 55,4% уваходзілі ва ўрадавыя партыі. Калі ўлічыць, што ад першага сходу гарадскіх выбарщчыкаў прайшло 20% правых, а ад другога — 11%, а таксама 117 са 176 правых выбаршчыкаў ад сялян, то на апошняй стадыі выбараў відавочна пераважалі прыхільнікі ўрадавых партый і груповак[32].

Выкарыстаўшы перавагу, дадзеную выбарчым законам, падтрымку дзяржаўных органаў і царквы, акцябрысцка-манархічны блок заваяваў на выбарах у Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай губернях 15 дэпутацкіх мандатаў. Усяго ад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў у Дзяржаўную думу 3-га склікання прайшлі 29 правых і 7 ліберадаў. У ліку апошніх адзін мірнаабнаўленец і 6 дэпутатаў ад Краёвай партыі Літвы і Беларусі[33]. Можна канстатаваць, што ў Паўночна-Заходнім краі ўплыў правых партый на выбаршчыкаў, асабліва сялян, быў больш значны, чым па імперыі ў цэлым. Шавіністычная палітыка царызму, якая распальвала нацыянальную варожасць паміж беларусамі і палякамі, беларусамі і яўрэямі, рускімі, палякамі і яўрэямі давала магчымасць чарнасоценцам дзейнічаць больш актыўна.

Дэпутаты правых партый ад беларуска-літоўскіх губерняў, у тым ліку сяляне, актыўна падтрымалі ўрадавую палітыку, аграрную і земскую рэформы П.А.Сталыпіна. Па аграрным пытанні частка сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі выказалася за неабходнасць надзялення зямлёй малазямельных сялян. У ходзе перадвыбарчай барацьбы ў органах друку правых партый і арганізацый, у думскіх спрэчках праявілася імкненне праваслаўнага беларускага заможнага сялянства з дапамогай улад дамагчыся абмежавання ў беларуска-літоўскіх губернях польскага памешчыцкага землеўладання і павялічыць за яго кошт уласнае.

Звязваючы ажыццяўленне сваіх інтарэсаў з нацыянальнай палітыкай царызму, думскія дэпутаты ад праваслаўнага беларускага кулацтва і яго групоўкі на месцах (таварыствы "Крестьянин", "Белорусское общество") вялі барацьбу з беларускім нацыянальным рухам, з газетай "Наша ніва". Такую ж пазіцыю ў адносінах да гэтага руху займалі польскія памешчыкі, клерыкалы і думскія дэпутаты ад Віленскай губерні (польска-літоўска-беларуская групоўка).

"Наша ніва" не падтрымлівала ўвядзенне нацыянальных курый, паколькі новы выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. зусім не ўлічваў факт існавання беларускай нацыі, адносіў праваслаўных беларусаў да "рускай", а католікаў — да "польскай" курый. Газета крытыкавала шавіністычную дзейнасць рускіх і польскіх памешчыцкіх арганізацый, а таксама мясцовай адміністрацыі.

"Наша ніва" выступала супраць урадавага варыянта закона аб земствах. Грамадска-палітычная барацьба ў сувязі са стварэннем земскіх устаноў у заходніх губернях паказала слабасць беларускай нацыянальнай буржуазіі, прадстаўленай у асноўным кулацтвам. Буржуазія вывела на палітычную арэну акцябрысцка-манархічныя арганізацыі — таварыствы «Крестьянин», «Белорусское общество» — забяспечыла абранне іх дэпутатаў у III Дзяржаўную думу. Адчуваючы сваю слабасць, яны арыентаваліся на саюз з мясцовым рускім дваранствам на платформе вялікадзяржаўнага шавінізму. Значная частка каталіцкага кулацтва арыентавалася на польскіх памешчыкаў і ксяндзоў. Абедзве групоўкі вялі міжусобную барацьбу за панаванне ў Паўночна-Заходнім краі.

У 1912 г. на аснове выбарчага закона ад 3 чэрвеня 1907 г. прайшлі выбары ў Дзяржаўную думу 4-га склікання. Насельніцтва зноў было падзелена па нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці на курыі, сярод якіх пераважала руская. Мясцовыя органы ўлады адкрыта абапіраліся на крайне правыя арганізацыі. Выбарчая кампанія адбывалася пад сцягам узмацнення пазіцыі дваранства ў Думе і наогул ў палітычным жыцці краіны. У цыркулярах, разасланых у губерні за подпісам міністра ўнутраных спраў А.А.Макарава, прадпісвалася весці выбарчую кампанію ў саюзе і згодзе з дваранствам, а таксама шырока прыцягваць праваслаўнае духавенства.

Для гэтай выбарчай кампаніі быў характэрны найбольшы абсентэізм у параўнанні з усімі папярэднімі. Поўную абыякавасць праявілі дробныя землеўладальнікі. З 280 выбаршчыкаў ад землеўладальніцкай курыі большасць уваходзіла ў партыі і групоўкі кансерватыўна-манархічнага лагера. Масавыя няяўкі выбаршчыкаў на першай стадыі выбараў былі зафіксаваны сярод яўрэйскага насельніцтва і сялянства заходніх губерняў. Колькасць губернскіх выбаршчыкаў у IV Дзяржаўную думу па Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у параўнанні з выбарамі ў II Думу павялічылася з 542 да 579 чалавек. Гэта акалічнасць тлумачылася ўзрастаючым уплывам правых партый і праваслаўных святароў і адбілася на партыйным складзе губернскіх выбаршчыкаў, што паўплывала і на партыйны склад дэпутатаў IV Думы ад 5 заходніх губерняў. "Рускія", "Саюз рускага народа" і вялікадзяржаўныя нацыяналісты заваявалі 27 месцаў, акцябрысты — 3, лібералы — 6 месцаў[34]. Кадэты ўнеслі на абмеркаванне дэпутатаў IV Думы некалькі законапраектаў: аб дэмакратычных свабодах; аб усеагульным выбарчым праве і інш. Усе выступленні акцябрысцка-кадэцкага альянсу выклікалі негатыўную рэакцыю правай часткі Думы. Правыя патрабавалі ад урада ўзмацнення рэпрэсій, утаймавання "іншародцаў", больш увагі да царкоўнапрыходскіх школ. Мінскі епархіяльны місіянер К.М.Акаловіч заклікаў да новага

"крыжовага паходу" супраць каталікаў і ўмацавання пазіцый праваслаўнай царквы. Іншыя дэпутаты ад Беларусі таксама цвёрда стаялі на пазіцыях правых і нацыяналістаў. Сапраўдных абаронцаў сацыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа ў гэтай Думе не было. У карэспандэнцыі з Міншчыны Зм. Жылуновіч (Ц.Гартны) пісаў у "Нашу ніву", што ў Дзяржаўнай думе "... усе народы маюць сваіх прадстаўнікоў, якія змагаюцца за права сваёй нацыі. А наша Беларусь пасылае ў Думу толькі чарнасоценных дэпугатаў. Паўловічы ды Юрашкевічы, выступаючы ад беларускіх губерняў, толькі робяць шкоду і крыўду ўсім жыхарам сваімі чалавеканенавісными прамовамі, другія ж увесь час прасядзяць, слова не вымавіўшы"[35].

Рэдакцыя "Нашай нівы" па-ранейшаму ўскладала надзеі на Думу, якая мусіла "расчысціць тую дарогу, на якую ірвалася ўся культурная Расія". Але на гэтым шляху, як адзначала газета, знаходзяцца правыя, акцябрысты і нацыяналісты[36].

Цар і яго акружэнне, "истинно-русские" партыі і іх органы друку ў Беларусі не хацелі прызнаваць, што выспявае новая рэвалюцыя, урадавая палітыка церпіць крах і што нават партыі думскай большасці змянілі тактыку і перайшлі да канфрантацыі з урадам. Іх непакоіла тое, што "прагрэсіўныя партыі ўсё больш рашуча станавіліся на бок палякаў і яўрэяў". Акцэнт барацьбы супраць палякаў адбіваўся і на ўзмацненні крытыкі палітыкі Думы з боку "Нашай нівы".

Уступленне Расіі ў Першую сусветную вайну прывяло да ўсплёску шавіністычных настрояў у краіне. Манархісты, акцябрысты і прагрэсісты адкінулі палітычныя рознагалоссі і ўключыліся ў антыгерманскую істэрыю. У ліпені 1915 г. у Думе быў створаны "Прагрэсіўны блок", у які ўвайшоў і дэпутат ад Беларусі Ф.І.Лашкейт. У заходніх губернях правы друк, у прыватнасці, газеты "Виленский вестник", "Северо-Западная жизнь", рэзка выступіў супраць стваранага ў Думе блока, абвінавачваў яго ў пашырэнні правоў яўрэяў.

Прагрэсісты распрацавалі свой праект эканамічнага развіцця Расійскай імперыі. Паводле ўяўленняў тэарэтыкаў "прагрэсізму", ва ўмовах капіталістычнай мадэрнізацыі краіны "сцяг прагрэсу" з рук дваранства перайшоў да гандлёва-прамысловых дзеячаў. У адпаведнасці з гэтым стваралася новая сістэма каштоўнасцей, цэнтральнай фігурай якой станавіўся "перадавы" прадпрымальнік. Прагрэсісты лічылі, што першачарговымі нацыянальнымі задачамі з'яўляліся пераўтварэнне Расіі ў развітую індустрыяльную краіну, стварэнне магутнага эканамічнага фундамента пад сістэмай новай прававой дзяржавы[37].

У 1916 г. у сувязі з набліжэннем фронту да Вільні выданне "Нашай нівы" спынілася. Расійскі дарэвалюцыйны парламент афіцыйна перастаў існаваць 6 кастрычніка 1917 г., калі пачаў работу II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Галоўная прычына таго, што Дзяржаўная дума не выканала сваёй гістарычнай місіі — не вырашыла галоўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця, — была ў адсутнасці падтрымкі яе з боку асноўнай масы насельніцтва. У Расіі адсутнічала традыцыя цывілізаваных палітычных адносін і кампраміснага вырашэння сацыяльных і палітычных канфліктаў. Недаацэньвалі ролю парламента імператар і падначалены яму ўрад. Пераход да правядзення адкрытай палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму садзейнічаў яшчэ большаму размежаванню палітычных сіл і набліжаў новую рэвалюцыю. Свой значны ўклад у развіццё рэвалюцыйнага руху ў Беларусі ўнесла і першая беларуская народная газета "Наша ніва".

---

[1] Сперанский Н.М. Проекты и записки. М.—Л., 1961. С. 192—197.

[2] Полное собрание законов Российской империи. Собр. третье. Т. XXV. СПб., 1908. № 26656.

[3] Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). Мн., 1999. С. 11.

[4] Там жа. С. 12.

[5] Новейшие преобразования русского государственного строя. СПб., 1906. С. 453.

[6] Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). С. 13.

[7] Кирьянов Ю.И., Лукьянов М.Н. Парламент самодержавной России: Государственная дума и ее депутаты. 1906—1907. Пермь, 1995. С. 39—40.

[8] Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). С. 38.

[9] Государственная дума: Стенографические отчеты. Сессия III. Т. 1. СПб., 1906. Стб. 109.

[10] Там жа. С. 197.

[11] Там жа. С. 206.

[12] Там жа. С. 198.

[13] Там жа. С. 249.

[14] Там жа. С. 560—562.

[15] Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). С. 56—57.

[16] Там жа. С. 57—60.

[17] Наша ніва. 1906, 10 лістапада.

[18] Там жа. 1907, 18 лютага.

[19] Там жа. 1907, 6 красавіка.

[20] Там жа. 1906, 22 снежня.

[21] Там жа. 1907, 11 лютага.

[22] Там жа. 1907, 13 красавіка.

[23] Там жа. 1907, 20 красавіка.

[24] Там жа. 1906, 24 лістапада.

[25] Там жа. 1907, 23 красавіка.

[26] Там жа. 1907, 25 студзеня.

[27] Там жа. 1907, 23 красавіка.

[28] Там жа. 1907, 18 мая.

[29] Там жа. 1907, 24 лютага.

[30] Там жа. 1907, 11 мая.

[31] Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). С. 74—75.

[32] Там жа. С. 206.

[33] Там жа. С. 98—99.

[34] Там жа. С. 137.

[35] Наша ніва. 1913, 18 студзеня.

[36] Там жа. 1912, 19 ліпеня.

[37] Политические партии России: история и современность. М., 2000. С. 137—141.